**І. Р. КАЗАЧЭНКА**,
настаўнік-метадыст Лельчыцкай раённай гімназіі

# ГУЛЬНЯ «ЧОРНЫ КОТ» на падагульняльных уроках беларускай мовы ў VIII класе

## *Урок 67.* Падагульненне і сістэматызацыя вывучанага за год

М э т ы: падагульніць і сістэматызаваць веды вучняў па раздзеле «Просты сказ»; удасканаліць моўныя аналітыка-сінтэтычныя і маўленчыя навыкі вучняў.

А б с т а л я в а н н е: гульнёвае поле; кубік; інтэрактыўнае практыкаванне; QR-коды-спасылкі; тэставыя заданні.

### Ход урока

**I. Арганізацыйны момант. Псіхалагічны настрой.**

Н а с т а ў н і к. Добры дзень! Вітаю на ўроку тых, хто спяшаўся на заняткі, хто прыехаў аўтобусам, пешшу прыйшоў. Прапаную вам цікавыя заданні і чакаю ад вас удумлівых і дакладных адказаў. Жадаю ўсім поспеху.

**II. Праверка дамашняга задання.**

**III. Мэтавызначэнне.**

На сённяшнім уроку нам неабходна:

- узнавіць і сістэматызаваць веды... *(аб простым няўскладненым сказе)*;
- замацаваць навыкі... *(адрознення відаў простых сказаў, сінтаксічнага разбору сказаў)*;
- выканаць... *(прапанаваныя заданні)*.

**IV. Падагульненне і сістэматызацыя вывучанага.**

**Правядзенне гульні «Чорны кот».**

Для гульні рыхтуецца поле пытанняў (малюнак). Клас дзеліцца на каманды. Прадстаўнікі каманд па чарзе кідаюць ігральны кубік. Рух па полі пытанняў пачынаецца ад клеткі «Старт» і адбываецца па гадзіннікавай

стрэлцы. Пытанні, на якія атрыманы адказы, у наступным крузе і далей не ўлічваюцца. Нумар чарговага пытання адлічваецца ад толькі што разыгранай клеткі. Колькасць кругоў, па якіх ідзе рух, неабмежаваная.

Калі ход прыпадае на клетку з чорным катом ці пытальнікам, каманда, якая кідала кубік, атрымоўвае заданне на спецыяльнай картцы.

Першай адказвае каманда, якая кідала кубік. Калі адказ няправільны, іншыя каманды могуць на працягу адной хвіліны прадоўжыць абмеркаванне, а затым агучыць уласную версію. У выпадку, калі ніводная каманда не дасць правільны адказ, пытанне асвятляе настаўнік і робіць адпаведны каментарый.

За кожны правільны адказ прысуджаецца адзін бал (падлік вядзецца шляхам запісу на дошцы ці з дапамогай фішак, наклеек, стыкераў).

**Гульнёвае поле**




**Умоўныя абазначэнні на гульнёвым полі:**

СЛ — словазлучэнне;

ГЧ — галоўныя члены сказа;

ДЧ — даданыя члены сказа;

АДН — аднасастаўныя сказы;

ДВС — двухсастаўныя сказы;

**?** — тэорыя;

 — сектар «чорны кот».

**Пытанні**

**СЛ-1.** Вызначце від сувязі ў словазлучэннях.

1) Першы снег; 2) прыбраны да свята; 3) зорнае неба; 4) стаяць непадалёку; 5) падарунак брата; 6) выканаць па-майстэрску; 7) вучыцца разам; 8) заначаваць у дарозе; 9) тоўстая асіна; 10) ведаць праўду.

**Адказы:** 1) дапасаванне; 2) кіраванне; 3) дапасаванне; 4) прымыканне; 5) кіраванне; 6) прымыканне; 7) прымыканне; 8) кіраванне; 9) дапасаванне; 10) кіраванне.

**СЛ-4.** Перакладзіце словазлучэнні на беларускую мову.

Благодарить друга, более ста, болеть гриппом, видеть своими глазами, говорить в пользу, дом в пять этажей, жить с родителями, забыть о сне, извините меня, писать по адресу.

**Адказы:** дзякаваць сябру, больш за сто, хварэць на грып, бачыць на свае вочы, гаварыць на карысць, дом на пяць паверхаў, жыць пры бацьках, забыцца на сон, прабачце мне, пісаць на адрас.

**СЛ-7.** Адзначце словазлучэнні.

1) Жаданне вучыцца; 2) новы пасёлак; 3) шчыра адказаць; 4) насупраць студні; 5) адцвіла чаромха; 6) брат і сястра; 7) пайсці ў рыбу; 8) трыццаць пяць; 9) адзін вучань.

**Адказ:** 1, 2, 3, 4, 7, 9.

**ГЧ-2.** Адзначце сказы, у якіх падкрэсленыя словы з'яўляюцца дзейнікам.

1) Дваццаць дзеліцца на пяць без астачы.
2) Аранжавы — нацыянальны колер Нідэрландаў.
3) Мне лета дарыла рамонкі ў пацерках дзён прамяністых.
4) На Мурамскай дарожцы стаялі тры сасны.
5) Заўтра будзе больш шчаслівым.
6) Бацька і маленькі Андрэйка кожны выхадны дзень хадзілі ў невялікі бярэзнік.
7) Адпачываць тут — адно задавальненне!
8) Паблякла на небе Вялікая Мядзведзіца.
9) За ноч выпала многа снегу.
10) Водар чаромхі на крылах прынёс радасць надзеі.

**Адказ:** 1, 4, 5, 6, 8, 9.

**ГЧ-10.** Прачытайце сказы, знайдзіце граматычныя асновы, вызначце від выказнікаў у сказах і спосабы іх выражэння.

1) Жыве ў маім сэрцы побач з любоўю да Радзімы любоў да мовы.
2) Любоў да прыроды — гэта частка любві да Радзімы.

3) Хачу бясконца славіць наш родны беларускі край.

4) Без Радзімы і без свайго народа чалавек не можа жыць.

5) Сустрэча з роднымі мясцінамі была незабыўнай.

6) Ніколі не паставіць на калені наш народ!

**Адказ.** 1) Жыве *(просты дзеяслоўны выказнік; выражаны дзеясловам абвеснага ладу цяперашняга часу адзіночнага ліку)* любоў. 2) Любоў — гэта частка любві *(састаўны іменны выказнік; выражаны словазлучэннем)*. 3) Хачу славіць *(састаўны дзеяслоўны выказнік; выражаны інфінітывам «славіць» і дапаможным дзеясловам «хачу»)*. 4) Чалавек не можа жыць *(састаўны дзеяслоўны выказнік; выражаны інфінітывам «жыць» і дапаможным дзеясловам «не можа»)*. 5) Сустрэча была незабыўнай *(састаўны іменны выказнік; выражаны дапаможным дзеясловам «была» і дзеепрыметнікам «незабыўнай»)*. 6) Не паставіць *(просты дзеяслоўны выказнік; выражаны інфінітывам)*.

**ДЧ-3.** Выканайце інтэрактыўнае практыкаванне.

| | |
|---|---|
| https://learningapps.org/view17855673 | |

**АДН-5.** Адзначце аднасастаўныя развітыя сказы.

1) Раніца.
2) Халодны вечар.
3) Марозіць.
4) Снег.
5) Спяшаюся ў школу.
6) Люблю жыццё.
7) Маці чакае сына.
8) У баброў будаўніцтва жылля вядзецца па плане.
9) Звініце, жаўранкі натхнёныя!
10) Сядзець зімою ля каміна цёпла, утульна.

**Адказ:** 2, 5, 6, 8, 10.

**АДН-8.** Вызначце від аднасастаўных сказаў.

1) Усім хацелася есці.
2) Сонца. Кветкі. Зеляніна.
3) Паміраць збірайся, а жыта сей.
4) Іду праз жыта па вузенькай палявой дарозе.
5) Уставалі рана, палілі ў печы.

**Адказ:** 1) Безасабовы. 2) Назыўныя. 3) Абагульнена-асабовы. 4) Пэўна-асабовы. 5) Няпэўна-асабовы.

**ДВС-6.** Адзначце сказы, у якіх на месцы пропуску абавязкова ставіцца працяжнік.

1) Сёння старадаўнія слуцкія паясы _ рарытэт.
2) Вясна зіме _ не ўказчыца.
3) Дзіцячы смех _ як срэбраны званочак.
4) Вырошчваць кветкі _ прыемны занятак.
5) Мінскі метрапалітэн, відавочна, _ самы экалагічна чысты від гарадскога транспарту.

**Адказ:** 1, 4.

**ДВС-9.** Зрабіце сінтаксічны разбор сказа.

Арлы, ледзь прыўзняўшы галовы, глядзелі ў глыбокае сіняе неба.

**Адказ.** Арлы, ледзь прыўзняўшы галовы, глядзелі ў глыбокае сіняе неба.

**?** — тэрмін: Асноўная адзінка сінтаксісу, сродак фарміравання і паведамлення думкі, перадачы эмоцый і волевыяўлення. *(Сказ.)*

**?** — тэрмін: Сказ, у якім прапушчаны адзін або некалькі членаў сказа. *(Няпоўны.)*

Адкажыце на пытанне. Патлумачце, чаму не ставіцца працяжнік паміж дзейнікам і выказнікам у наступным сказе: *Увосень ночы доўгія. (Выказнік доўгія выражаны прыметнікам.)*

Выправіце памылкі.

1) Пры пераходзе дарогі трэба ўлічваць аб усім.
2) Хлопчык перажываў аб спазненні вячэрняй электрычкі.
3) Спартсмен быў упэўнены ў сваю перамогу.

**Адказ.** 1) Пры пераходзе дарогі трэба ўлічваць усё. 2) Хлопчык перажываў за спазненне вячэрняй электрычкі. 3) Спартсмен быў упэўнены ў сваёй перамозе.

Перабудуйце прапанаваны сказ у магчымыя віды аднасастаўных сказаў.

Вечар апускаецца на зямлю.

**Адказ**

| | |
|---|---|
| Безасабовы | Вэчарэе. |
| Назыўны | Вечар. |

**V. Падвядзенне вынікаў, каменціраванне адзнак.**

**VI. Рэфлексія.**

| Сёння на ўроку я ўзнавіў веды... | На ўроку я змог ... | Мне было цікава... |
|---|---|---|
| | | |

**VII. Агучванне дамашняга задання.**

Складці сінквейн са словам «канікулы».

# *Урок 68. Падагульненне і сістэматызацыя вывучанага за год*

Мэты: падагульніць і сістэматызаваць веды вучняў па раздзеле «Ускладнены сказ»; удасканаліць моўныя аналітыка-сінтэтычныя і маўленчыя навыкі вучняў.

## Ход урока

**I. Арганізацыйны момант. Псіхалагічны настрой.**

**II. Праверка дамашняга задання.**

**Канікулы**

Доўгачаканыя, летнія.
Набліжаюцца, радуюць, надыходзяць.
Я вельмі чакаю лета.
Радасць.

**III. Мэтавызначэнне.**

На сённяшнім уроку нам неабходна:

- узнавіць і сістэматызаваць веды… *(аб простым ускладненым сказе)*;
- замацаваць навыкі… *(вызначаць у сказах аднародныя, адасобленыя члены, адасобленыя і ўстаўныя канструкцыі)*;
- выканаць… *(прапанаваныя заданні)*.

**IV. Падагульненне і сістэматызацыя вывучанага.**

Правядзенне гульні «Чорны кот».

Умовы гульні прапанаваны ў плане-канспекце папярэдняга ўрока.

**Гульнёвае поле**




**Умоўныя абазначэнні на гульнёвым полі:**

АЧ — аднародныя члены сказа;
З — зваротак;
ПС — пабочныя словы;
АБЧ — абагульняльныя члены сказа;
ПЗ — параўнальныя звароты;
**?** — тэорыя;  — сектар «чорны кот».

**Пытанні**

**АЧ-1.** Запішыце сказы, у якіх на месцы ўсіх пропускаў неабходна паставіць коскі.

1) І лёгенькі_ трапятлівы ветрык неяк вельмі ж ужо спеўна прабегся па босых нагах_ па руках_ патрымцеў над самым тварам і, зачапіўшыся за валасы, хуценька павярнуўся назад.

2) Кот Максім ляжаў у баразне_ лопаў хвастом па бульбоўніку_ і зацікаўлена пазіраў, як грабуцца ў пыле куры.

3) Яны прынеслі з сабой шум ветру_ і дрэў_ пах дажджу_ і поля.

4) І старшыня калгаса_ і сакратар райкама былі людзьмі жыццелюбівымі_ таварыскімі, і таму адразу ўся бяседа закружылася вакол іх_ завесялілася_ заўсміхалася_ загула.

5) Побач раскошна ласкавеў пад цёплым і мяккім_ перадасеннім сонцам бадзяк_ буяў, шчодра раскрыўшы свае кветкі.

**Адказ:** выпісаць сказы 1, 4; паставіць коскі на месцы ўсіх пропускаў.

**АЧ-6.** Размясціце сказы ў правільным парадку, пастаўце патрэбныя знакі прыпынку.

1) Усе і Воўк і Мядзведзь і Заяц і Вавёрка і Ліса аднадушна вырашылі, што невядомую рэч трэба паказаць Саве.

2) Малы і стары дужы і слабы высокі і нізкі смелы і баязлівы кожны ведаў і паважаў Саву.

3) Мудрая Сава, што жыла ў дупле старога дуба, магла рассудзіць усё і спрэчкі і звады і скаргі і бойкі.

4) Аднойчы маленькі Вожык знайшоў на палянцы цікавыя рэчы рукзак газету пачак.

**Адказ:** 3, 2, 4, 1.

**З-2.** Адзначце сказы, у якіх допушчаны памылкі ў выдзяленні зваротаў знакамі прыпынку.

1) Спадарыня, мне сумна аднаму, спадарыня, мне аднаму сцюдзёна. Пра Вас адну я думаю штодзённа, марнею і не ведаю чаму.

2) Княгіня харacтва я верны Ваш халоп, капрызаў Вашых неадступны лёкай, і колькі навальніц ні адгуло б, мне не наблізіцца да Вас, далёкай.

3) Я прашуся ў парабкі да Вас, гаспадыня зорнага палаца.

4) Зоркі нашы ў небе без нас пазнаёміліся выпадкова.

5) Зоркі нашы толькі б не згас позірк ваш і ў начы, і ў блакіце.

**Адказ:** 2, 5.

**ПС-3.** Выпішыце сказы з пабочнымі канструкцыямі.

1) Алелька быў як кажуць жыцькоўцы вельмі злы на работу.

2) Домік маленькі бачу я знеслі.

3) Прашу вас, паверце мне ў мае словы. Яны сапраўды шчырыя.

4) Чалавечая памяць як вядома выбарачная, адно ўтрымлівае лепш, другое горш.

5) Хутка стала вядома, што адлёт самалёта затрымліваецца.

**Адказ:** 1, 2, 4.

**ПС-7.** Адзначце сказы з пабочнымі словамі (А), словазлучэннямі (Б) і сказамі (В). Адказ запішыце ў выглядзе шыфру «лічба — літара».

1) Я, скажу шчыра, узрадаваўся сустрэчы з роднымі мясцінамі.

2) Дык чаго ж ты плакала? Можа, пакрыўдзіў хто?

3) Узгоркі змяняліся лагчынамі, пасля зноў ішло поле, і, нарэшце, магутная сцяна старога лесу вырасла як з-пад зямлі.

4) Адна гульня пераходзіла ў другую. Словам, дзеці не сумавалі.

5) Верасень быў ціхі, цёплы і, на шчасце, без дажджоў.

6) Шчырай размовы, як я спадзяваўся, не атрымалася.

7) Раней тут, казалі старыя, стаяў княжацкі палац.

8) На мой розум, гэта бясспрэчная праўда.

**Адказ:** 1Б, 2А, 3А, 4А, 5Б, 6В, 7В, 8Б.

**АБЧ-8.** Адзначце сказы, у якіх неабходна адасобіць дзеепрыметнікавы зварот.

1) Ляжыць перад намі ўмыты агнямі чароўны прастор.

2) Палі засеяныя дбалымі рукамі дружна зелянелі маладымі ўсходамі.

3) Творы адрасаваныя дарослым і дзецям вучаць любіць і шанаваць зямлю.

4) Змрок ужо агортваў зямлю асядаючы хмарай.

5) Дзяўчынка ціхенька шмыганула за істопку ў зарослы дзядоўнікам гародчык.

**Адказ:** 2, 3.

**АБЧ-10.** Адзначце сказы, у якіх адасабляецца акалічнасць, выражаная дзеепрыслоўным зваротам.

1) Маўчыць зямля набракшы сокам.

2) Не хачу, не прывык склаўшы рукі хадзіць…

3) Галлё спусціўшы над парканам расла тут грушка з тонкім станам.

4) Выветрыўшы неба ходзяць халады.

5) Пайшоў Амелька нос павесіўшы.

**Адказ:** 1, 3, 4.

**ПЗ-5.** Спішыце, пастаўце, дзе трэба, знакі прыпынку ў сказах з параўнальнымі зваротамі. Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку.

1) Затоена-ціха нібы ў дазоры стаіць за сцяною марозная ноч.

2) Паэзія Якуба Коласа — такая ж натуральная, такая простая і такая складаная як і сама прырода.

3) Над лесам, выплыўшы з туману, стаяў месяц, мяккі і ціхі, ён быў цяпер белы што малако.

4) Словы дзядзькі гучалі як прароцтва.

5) Дуб як вежа вартавая.

**Адказ:** 1) Затоена-ціха, нібы ў дазоры, стаіць за сцяною марозная ноч. 2) Паэзія Якуба Коласа — такая ж натуральная, такая простая і такая складаная, як і сама прырода. 3) Над лесам, выплыўшы з туману, стаяў месяц, мяккі і ціхі, ён быў цяпер белы, што малако. 4) Словы дзядзькі гучалі як прароцтва. 5) Дуб як вежа вартавая.

**ПЗ-9.** Адзначце сказы, у якіх на месцы пропускаў ставяцца коскі.

1) А займаўся маім выхаваннем не хто іншы __ як дзядуля.

2) Уліваецца __ нібы ручай __ у мову палескі нетаропкі гаварок.

3) У такую пару ўсе дрэвы __ што белыя і ружовыя воблакі.

4) Дзед Стась замоўк __ бы мыла з'еўшы.

5) Сінія вочкі __ што васілёчкі.

**Адказ:** 1, 2.

**?** — Словы, словазлучэнні і сказы, пры дапамозе якіх моўца выражае свае адносіны да таго, пра што ён паведамляе. *(Пабочныя.)*

**?** — Слова ці спалучэнне слоў, якімі называюць таго, да каго звяртаюцца. *(Зваротак.)*



Адшукайце ў філвордзе назвы васьмі тэрмінаў вывучанага раздзела.

| | | | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| А | К | А | Л | І | Ч | Н | А | С | Ц | Ь | Ь | Ю |
| Ю | Ш | З | Ф | Ж | Ь | Ш | М | Ж | Ю | П | Ж | Ц |
| В | Ь | Н | Ь | Х | Ў | Ь | Ф | Ш | М | Ю | Ы | Ь |
| Ы | Х | А | Д | А | С | А | Б | Л | Е | Н | Н | Е |
| К | Ж | Ч | М | Ф | М | Ь | М | Ь | М | Ь | М | Ў |
| А | Ы | Э | Ш | Х | З | В | А | Р | О | Т | А | К |
| З | М | Н | Ы | Ь | Ф | Ы | Х | Ф | Й | Ў | Ф | Ў |
| Н | Ь | Н | Ш | Ў | Ф | Д | З | Е | Й | Н | І | К |
| І | Ш | Е | Ь | Х | Ў | Ф | С | К | А | З | Ў | Й |
| К | Х | Ь | Ш | Ф | Ы | Ў | Ф | Ь | Й | Ў | Й | Ў |
| Ь | У | Д | А | К | Л | А | Д | Н | Е | Н | Н | Е |

Перад вамі словы, у якіх пераблытаны парадак літар. Размясціце літары ў такім парадку, каб атрымаліся тэрміны з вывучаных вамі раздзелаў.

Ныаўзын аксз, езабосаывб, нпяэнаў-босасыв, авзортак, даабсаелнен, злслоавуэчнэне, вдхасуастнўы.

**Адказ:** назыўны сказ, безасабовы, няпэўнаасабовы, зваротак, адасабленне, словазлучэнне, двухсастаўны.

Перабудуйце няправільна пабудаваныя сказы.

1) Назбіраныя грыбы за дзень турысты падсмажылі на вячэру.

2) Ля дарожкі раслі кветкі пасыпанай жоўтым пясочкам.

3) Даручанае класу заданне настаўнікам мы выканалі ахвотна.

**Адказ.** 1) Грыбы, назбіраныя за дзень, турысты падсмажылі на вячэру. 2) Ля дарожкі, пасыпанай жоўтым пясочкам, раслі кветкі. 3) Заданне, даручанае класу настаўнікам, мы выканалі ахвотна.

**V. Падвядзенне вынікаў, каменціраванне адзнак.**

**VI. Рэфлексія.**

| Сёння на ўроку я ўзнавіў веды... | На ўроку я змог ... | Мне было цікава... |
|---|---|---|
| | | |

**Спіс выкарыстанай літаратуры**

*Бадзевіч, З. І.* Беларуская мова : вучэб. дапам. для 8-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / З. І. Бадзевіч, І. М. Саматыя. — Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2020. — ?? с.

*Бадзевіч, З. І.* Беларуская мова. Тэставыя заданні. 8 клас : дапам. для настаўнікаў устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / З. І. Бадзевіч, І. М. Саматыя : у 2 ч. — 2-е выд. — Ч. 2. — Мазыр : Выснова, 2017.

*Кислова, О. А.* Интеллектуальная игра «Чёрный кот» / О. А. Кислова // Нар. асвета. — 2020. — № 4. — С. 46—49.

*Саматыя, І. М.* Гэты няпросты просты сказ: 8 клас : вучэб.-метад. комплекс / І. М. Саматыя, В. С. Палтаржыцкая. — Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2010. — 200 с.

*Татарчук, А. І.* Мова вучыць чалавечнасці [Электронны рэсурс]. — Рэжым доступу: *https://www.n-asveta.by/dadatki/asambleya/2018/tatarchuk.pdf* — Дата доступу: 27.02.2021.

Цэнтралізаванае тэсціраванне. Беларуская мова : зборнік тэстаў / Рэсп. ін-т кантролю ведаў М-ва адукацыі Рэсп. Беларусь. — Мінск : Новое знание, 2018. — 56 с.